УДК 392.1(476+510)

Лю Івэнь, асіст.
(Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў, г. Цяньцзінь, КНР)

# ЖЫЦЦЁВАЕ КОЛА ЧАЛАВЕКА Ў АБРАДАВАЙ ПРАКТЫЦЫ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ: АГЛЯД ВЫДАННЯЎ

Беларусь і Кітай з іх працавітым і добразычлівым народам заўсёды беражліва адносіліся да сваёй традыцыйнай культурнай спадчыны. Маральна-духоўны складнік жыцця для грамадства ў цэлым і для кожнай яго асобы ў прыватнасці быў прыярытэтным як для беларусаў, так і для кітайцаў фактычна на ўсім шляху развіцця і станаўлення краін і трывала замацаваны ў абрадавай практыцы шматлікіх пакаленняў.

І беларусы, і кітайцы са старажытнасці высока цанілі захаванне гарманічнага пачатку ва ўсіх аспектах жыцця чалавека і грамадства і дакладна выконвалі рытуальныя дзеянні, каб забяспечыць такі баланс. Шматвяковы вопыт нашых продкаў сведчыць пра надзвычайную ўвагу да пераемнасці пакаленняў.

Вялікая колькасць ***беларускіх*** выданняў прысвечана пытанням захавання і трансляцыі народных традыцый. Разгледзім некаторыя з іх.

“Золотые правила народной культуры”, аўтары А. Катовіч, Я. Крук, выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”. Гэта грунтоўнае і надзвычай цікавае манаграфічнае выданне распавядае нам пра ўстойлівыя народныя традыцыі і звычаі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Аўтары сцвярджаюць, што традыцыі фарміравалі і мацавалі светапогляд людзей, выконвалі важную педагагічную, навучальна-выхаваўчую функцыю. Іх ролю ў духоўным жыцці народа цяжка пераацаніць. На нашу думку, асабліва цікавая для сучаснага беларускага, а тым больш для замежнага чытача інфармацыя пра “закон рытуальнай перагорнутасці” ў абрадавай практыцы беларусаў, сувязь паміж каляндарна-абрадавым цыклам і сямейнымі абрадамі, сакральнае значэнне лічбавых культурных кодаў і інш.

Варта адзначыць, што гэтая кніга ў 2020 годзе выйшла ў Кітаі ў перакладзе на беларускую мову — 《白俄罗斯民俗与文化：基于民间文化的田野调查》 Гэты факт не толькі сведчыць пра цікавасць кітайцаў да беларускай этнакультурнай спадчыны, але і сцвярджае ўстойлівы накірунак на далейшае развіццё ўзаемадачыненняў паміж нашымі народамі.





“Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі”, аўтар І. І. Калачова, выдавецтва НІА.

Беларусь шырока вядома ў свеце праз талерантнасць яе народа. Выданне прысвечана разгляду асноўных культурна-выхаваўчых традыцый беларусаў, рускіх, украінцаў, татараў, што жывуць на Беларусі. Прапануюцца практычныя парады па выкарыстанні традыцый ў выхаваўчых мэтах сёння. Для нас кніга цікавая менавіта праз яе міжкультурны характар, яна паказвае, як розныя традыцыі сплятаюцца, суіснуюць, узаемаўзбагачаюцца і ўплываюць адна на адну. Носьбіты і пераемнікі этнакультурнай інфармацыі — бацькі і дзеці, менавіта яны з’яўляюцца ключавымі элементамі трансмісіі этнічнай, у тым ліку абрадавай культуры. Аўтар сцвярджае, што народная педагогіка знайшла сваё прымяненне перш за ўсё ў сямейным выхаванні, і гэта пацвярджаецца цэлым комплексам сямейна-бытавой абраднасці.

“Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы”, аўтар Ракава Л. В. , выдавецтва “Ураджай”. Кніга прысвечана аналізу праблем традыцыйнага сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. Аўтарам паказана пераемная сувязь паміж традыцыямі і народнай педагогікай. Там, дзе не было месца традыцыям, не было месца духоўнасці. Інакш кажучы, традыцыйная беларуская культура акумулявала вопыт пакаленняў і выконвала ролю каталізатара і крыніцы развіцця народных уяўленняў аб сутнасці жыццёвага шляху чалавека, якія папаўняліся з пакалення ў пакаленне і перадаваліся праз выхаваўчыя традыцыі дзецям.

“Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Традыцыйна-бытавая культура”, аўтар В. С. Цітоў, выдавецтва “Беларусь”. У кнізе разглядаюцца асноўныя раздзелы народнай культуры, сярод якіх асаблівая ўвага надаецца традыцыйным ведам, звычаям, абрадам, вераванням. Кніга багата ілюстравана, і гэта асабліва каштоўна для замежных студэнтаў, якія могуць з ёй пазнаёміцца, таму што выявы артэфактаў культуры дапамагаюць правільна ўспрымаць і нематэрыяльную спадчыну народа.

“Беларуская народная педагогіка”, аўтар Г. П. Арлова, выдавецтва “Народная асвета”. Кніга прысвечана разгляду асноўных сродкаў народнай педагогікі і спосабаў і прыёмаў выхавання на аснове нацыянальных ідэй і думкі. Працоўнае, разумовае, маральнае, рэлігійнае, эстэтычнае, патрыятычнае і фізічнае выхаванне дзяцей у беларускай традыцыі было цесна звязана з глыбока ўкаранёнымі народнымі ўяўленнямі пра сутнасць жыццёвага шляху чалавека, замацаванымі ў абрадавай культуры ў тым ліку. Кніга надзвычай інфарматыўная для

замежнага чытача, які імкнецца спасцігнуць менталітэт беларусаў. Для нашага даследавання карысная ў частцы разумення пераемнасці традыцый і важнасці гэтага ў сістэме выхавання.

Пытанні гісторыі традыцыйнай ***кітайскай*** культуры, у тым ліку абрадавай, звязанай з жыццёвым шляхам чалавека, шырока асвятляюцца ў наступных выданнях:

《中国通史》吕思勉 中国文联出版社 — "Агульная гісторыя Кітая", аўтар Люй Сымянь, якое выйшла ў Выдавецкай карпарацыі Кітайскай федэрацыі літаратурных і мастацкіх колаў. Кніга грунтуецца на шырокім і глыбокім супастаўленні старажытнага і сучаснага. На аснове строгага навуковага падыходу папулярнай мовай распавядаецца пра развіццё эканамічнай і палітычнай сістэмы Кітая, культурныя і акадэмічныя дасягненні, у тым ліку 18 катэгорый, такіх як шлюб, кланавая сістэма, палітычная сістэма, клас, уласнасць, афіцыйны ранг, выбары і г.д.. Кніга падрабязна знаёміць з паходжаннем кітайскай нацыі і традыцыйнай культурай і звычаямі Кітая. У першай частцы апісваецца шлюбная сістэма краіны, дзе дэталёва вывучаецца эвалюцыя падыходаў да шлюбу. Менавіта праз дадзенае выданне можна пазнаёміцца з шасцю рытуаламі старажытных вяселляў.

《国学常识》梦远 中国华侨出版社 — "Звычайныя веды па класічнай кітайскай адукацыі", аўтар Мэн Юань, выйшла ў Кітайскім замежным выдавецтве. Праца паказвае нам глыбіню і ўсёабдымны характар кітайскай культуры. Гэтая кніга ўяўляе сабой у вышэйшай ступені удасканалены і кароткі агляд мыслення, паводзінаў і ладу жыцця кітайцаў за тысячы гадоў. Аўтар Мэн Юань абраў найбольш прадстаўнічы, практычны і самы цікавы кантэнт для чытачоў. Вывучэнне кітаязнаўства, разуменне кітаязнаўства, атрыманне ў спадчыну і прасоўванне кітайскай культуры — абавязковая адказнасць кітайца. У шостай частцы кнігі "Этыкет і звычаі" аўтар падрабязна знаёміць з трыма аспектамі этыкі — нараджэнне, вяселле і пахаванне — самымі важнымі цырымоніямі, якія адыгрываюць важную ролю ў нашым жыцці.

《北大国学课》文章 北京联合出版社 — "Курс класічнай кітайскай адукацыі ў Пекінскім універсітэце", аўтар Вэнь Чжань, выйшла ў Пекінскай аб'яднанай выдавецкай кампаніі. Гэтая кніга падзелена на чатыры часткі ў адпаведнасці з класіфікацыяй класіка кітайскай традыцыйнай культуры Сыку Цюаньшу. Яна не толькі дае нам шмат ведаў пра скарбы кітайскай традыцыйнай культуры, каб кожны мог зразумець неабходнасць даследаванняў і навучання ў галіне кітаязнаўства, а таксама змяшчае розныя вынікі даследаванняў





і меркаванні вучоных Пекінскага ўніверсітэта. Праца дазваляе кожнаму зразумець глыбокую сутнасць многіх кітайскіх традыцыйных вучэнняў, такіх як даасізм, канфуцыянства. Дыскусіі па найважнейшых культурных пытаннях дазваляюць нам больш выразна ўсвядоміць шырыню і глыбіню кітайскай традыцыйнай культуры.

《中国哲学简史》冯友兰 长江文艺出版社 — "Кароткая гісторыя кітайскай філасофіі", аўтар Фэн Юлань, Выдавецтва літаратуры і мастацтва Чанцзян. Гэта літаратурны шэдэўр, складзены Фэн Юланем і апублікаваны Выдавецтвам літаратуры і мастацтва Чанцзяна. Аўтар Фэн Юлань — кітайскі філосаф і педагог. У сваёй кнізе ён узяў за аснову дух, змены і развіццё асноўных школ кітайскай філасофіі. Ён даў кароткі агляд гісторыі развіцця кітайскай філасофіі, адкрыў адпаведныя веды старажытнага і сучаснага Кітая і замежных краін. Аўтар інтэграваў уласнае разуменне кітайскай філасофіі, якая з'яўляецца крышталізацыяй гісторыі і мыслення, поўнай мудрасці жыцця і прасвятленняў вучоных, а таксама з'яўляецца філасофскай і культурнай класікай.

《中国古代文化常识》王力 北京联合出版社 — "Агульныя веды пра кітайскую старажытную цывілізацыю", аўтар Ван Лі, Пекінская аб'яднаная выдавецкая кампанія.

Аўтар "Агульных ведаў пра кітайскую старажытную цывілізацыю" Ван Лі — адзін з заснавальнікаў сучаснай кітайскай лінгвістыкі. Ён вучыўся ў Інстытуце кітайскай традыцыйнай культуры Універсітэта Цінхуа пад кіраўніцтвам Лян Цічаа, Ван Гавэя, Чжаа Юаньжэня і г.д. Гэтая кніга — легендарная агульная класіка па старажытнай кітайскай культуры пад рэдакцыяй прафесара Ван Лі. Кніга мае вялікую колькасць ілюстрацый, табліц і культурных рэліквій, літаратурных прыкладаў, больш зручных для інтуітыўнага разумення і назірання. Як сістэматычнае чытанне па старажытнай кітайскай культуры гэтая кніга абуджае цікавасць людзей да старажытнай культуры, а яе аўтар валодае бясспрэчным аўтарытэтам.

Сярод ***перакладных*** выданняў асобна хацелася б адзначыць серыю з 9 кніг "Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры: прэса па даследаванні і вывучэнні замежных моў: пер. з кітайскай", якая выдаецца найбуйнейшым беларускім выдавецтвам "Мастацкая літаратура" пачынаючы з 2019 года. Яна з'яўляецца вынікам даследаванняў Нацыянальнага праекта сацыяльнага фонду грамадазнаўства "Пераклад, распаўсюджванне і стварэнне баз дадзеных кітайскіх ідэалагічных культурных тэрмінаў". На сённяшні дзень выйшлі ўжо 6 кніг дадзенай серыі, пры гэтым пераклад 4–9 кніг ажыццяўляецца

супрацоўнікамі і аспірантамі Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў. Кнігі згаданай серыі ілюструюць сістэму кітайскага мыслення, культуру і дыскурс, складаюць сутнасць нацыянальнай кітайскай думкі. Мноства канцэптаў ілюструюць спрадвечныя, выпрацаваныя цягам часу ўяўленні пра сутнасць жыццёвага шляху чалавека і дазваляюць беларускім чытачам атрымліваць больш аб'ектыўнае і больш поўнае разуменне Кітая і яго народа.

Вышэйпералічаныя выданні дазволілі нам па-іншаму паглядзець на культуру і менталітэт беларускага народа і параўнаць яго з культурай і менталітэтам кітайскага народа з пункту гледжання жыццёвай філасофіі, адлюстраванай у традыцыйнай абрадавай практыцы. На наш погляд, абрадавыя дзеянні, звязаныя з асноўнымі этапамі жыццёвага шляху чалавека, дазваляюць нам убачыць пераемнасць традыцый народа і яго светапогляд. Яны ўяўляюць своеасаблівы канон, адступленне ад якога парушае гармонію ў прыродзе, сям'і і чалавеку.

УДК 655.53

Ю. А. Манкевіч, студ.
Навук. кір.: Д. П. Зылевіч, канд. філал. навук
(БДТУ, г. Мінск)

## ПРАСОЎВАННЕ ЧАСОПІСА ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ «БЯРОЗКА» Ў ІНТЭРНЭТ-ПРАСТОРЫ

У сучасным свеце важную ролю адыгрываюць інтэрнэт і сацыяльныя сеткі. Інтэрнэт акумулюе ў адзінай сетцы каласальную колькасць кампаній і спажыўцоў, а ў сацыяльных сетках карыстальнікі штосекундна дзеляцца і абменьваюцца рознага роду інфармацыяй [1].

Адна з асноўных тэндэнцый апошніх гадоў заключаецца ў тым, што выдавецтвы «не прывязаныя да паперы». Яны падаюць інфармацыю ў тым выглядзе, у якім гэтага хочуць чытачы: і ў формах самой кнігі, і ў рэкламе, і ў прасоўванні выдавецкай прадукцыі, у тым ліку пры дапамозе тэхналогій маркетынгу ў сацыяльных медыя.

Маркетынг ў сацыяльных медыя SMM (Social Media Marketing) — гэта прасоўванне тавараў і паслуг у сацыяльных сетках, а таксама працэс прыцягнення трафіку ці ўвагі да брэнду або прадукту праз сацыяльныя платформы; эфектыўны інструмент, з дапамогай якога наведвальнікі прыцягваюцца на сайт з сацыяльных сетак, супольнасцяў, блогаў, дзённікаў і форумаў. Аўдыторыя сацыяльных сетак параўнальная з аўдыторыяй тэлевізійных тэлеканалаў, толькі яна





больш уважлівая і актыўная. SMM мае больш агульнага з сеткавым PR, чым з рэкламай, бо гэта непасрэдная праца ў суполках, якія ахопліваюць мэтавую групу карыстальнікаў. Гэта інструменты прамога і схаванага ўзаемадзеяння з мэтавай аўдыторыяй [2].

На сённяшні дзень амаль немагчыма прадставіць чалавека, які б не карыстаўся сацыяльнымі сеткамі або не звяртаўся б да іх дапамогі ў пошуках інфармацыі. Таму не дзіўна, што многія кампаніі выкарыстоўваюць іх для прасоўвання сваіх паслуг. СМІ не з'яўляюцца выключэннем. Такія выдатныя друкаваныя СМІ Беларусі, як «СБ. Беларусь сегодня», «Комсомольская правда в Беларуси», «Аргументы и факты в Беларуси» і іншыя, маюць свае старонкі ў наступных сацыяльных сетках: Вконтакте, Instagram, YouTube, Facebook, Одноклассники.

Газеты і часопісы, якія маюць больш вузкую аўдыторыю, таксама выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі для прыцягнення новых чытачоў. Напрыклад, часопіс «Бярозка».

«Бярозка» — беларускі штомесячны грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, у якім ахопліваюцца выхаваўчы, адукацыйны, псіхалагічны, літаратурны, мастацтвазнаўчы і рэлігійны аспекты. Па сутнасці, гэта інтэлектуальны беларускамоўны глянец для падлеткаў.

У часопіса ёсць свае старонкі ў Instagram, Вконтакте і YouTube. Вядзеннем сацыяльных сетак займаюцца намесніца галоўнага рэдактара Валянціна Красоўская, рэдактар аддзела і дызайнер Паліна Гіл і пісьменніца Марыя Шкляр.

Youtube канал часопіса (https://www.youtube.com/channel/UCNTV3sGL_G8GdHu5JGzJotQ) быў створаны 14 лютага 2020 года і на дадзены момант налічвае дзевяць відэа, з якіх восем прысвечаны анонсам нумароў часопіса, а ў адным відэа ў жартоўнай форме раскрываецца змест твора «Жыццё Еўфрасінні Полацкай». Відэа выходзілі з перыядычнасцю раз у месяц. Аднак на працягу трох месяцаў на канале не назіраецца актыўнасці, з чаго мы можам зрабіць выснову, што дадзеная сацыяльная сетка не з'яўляецца асноўным інструментам прасоўвання часопіса.

Старонцы ў Instagram (https://www.instagram.com/bjarozka.mag/) надаецца больш увагі. Яна налічвае 100 публікацый. Тут мы можам знайсці інфармацыю аб выпусках часопіса, аб мерапрыемствах, якія праводзіць рэдакцыя, матэрыялы з нумароў часопіса і іншую інфармацыю. Напрыклад, 8 верасня быў апублікаваны пост, прысвечаны даце выхаду аповесці «Стары і мора» Эрнэста Хэмінгуэя. У ім утрымлівалася інфармацыя пра гэты твор, а таксама цытаты, выбраныя рэдакцыяй.